PolotskSU

УДК 347.195.2

**ФІЗКУЛЬТУРНА-АЗДАРАЎЛЕНЧЫЯ І СПАРТЫЎНЫЯ ЦЭНТРЫ ЯК СУБ'ЕКТЫ АЗДАРАЎЛЕНЧАГА ТУРЫЗМУ**

***В.В. Максіменюк,***
*старшы выкладчык кафедры грамадзянскага права, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

У цяперашні час адным з распаўсюджаных відаў турызму з'яўляецца аздараўленчы турызм.

Для мэтаў дадзеннага даследавання аўтар прапануе наступную дэфініцыю: аздараўленчы турызм – турыстычная падарожжа грамадзян Рэспублікі Беларусь, а таксама, замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, ў санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі для адпачынку і атрымання санаторна-курортных паслуг з мэтамі прафілактыкі і лячэння захворванняў, захавання і аднаўлення здароўя [1, с. 304].

У Рэспубліцы Беларусь пералік санаторна-курортных арганізацый, якія могуць прадастаўляць аздараўленчыя паслугі, ў тым ліку, – турыстам, нарматыўна вызначаны. Пералік аздараўленчых арганізацый усталяваны адкрытым і ўключае прафілакторыі, аздараўленчыя цэнтры (комплексы), аздараўленчыя лагеры, дамы (базы) адпачынку, пансіянаты, а таксама іншыя арганізацыі, калі адным з відаў іх дзейнасці з'яўляецца аздараўленне насельніцтва [2].

Аб'екты спартыўнай інфраструктуры, якая актыўна развіваецца, шмат у чым выкарыстоўваюцца для аказання аздараўленчых паслуг турыстам.

Пералік арганізацый фізічнай культуры і спорту ўсталяваны Законам Рэспублікі Беларусь «О физической культуре и спорте» [3]. У даследванні разглядаюцца толькі некаторыя з іх, у прыватнасці, фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўныя цэнтры (камбінаты, комплексы, цэнтры фізкультурна-аздараўленчай работы).

Пры разглядзе прававога статусу дадзенных арганізацый узнікае неадназначнае пытанне: разглядаць подобныя арганізацыі ў якасці самостойных суб'ектаў грамадзянскага права ці яны могуць не маць статус юрыдычнай асобы, і такім чынам, не валодаць грамадзянскай правасуб'ектнасцю?

У прыватнасці, Непрахін П.П., гаворачы пра ўвод у эксплуатацыю фізкультурна-спартыўных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь за перыяд з 2011 па 2014 гг., ўключае ў іх лік, як найпростыя спартыўныя пляцоўкі, так і шматфункцыянальныя фізкультурна-спартыўных комплексы, такія як «Чыжоўка-арэна» або спартыўна-забаўляльны комплекс «Мінская абласная комплексная дзіцяча-юнацкая спортыўная школа «Алімпік-2011» у Маладзечне [4, с. 117].

Паняцце спартыўнага збудавання змяшчаецца ў арт. 1 Закона Рэспублікі Беларусь «О физической культуре и спорте», згодна з якім фізкультурна-спартыўныя збудаванні – аб'екты, прызначанныя да заняткаў фізічнай культурай і спортам. Больш ёмістае паняцце змяшчае арт. 2 пастанаўлення Міжпарламенц-

PolotskSU

кай Асамблеі дзяржаў – удзельнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў № 33-23 «О новой редакции модельного закона «О физической культуре и спорте»: фізкультурна-аздараўленчыя, спартыўныя і спартыўна-тэхнічныя збудаванні – спецыяльна створаныя і абсталяваныя будынкі, пабудовы, фізкультурна-спартыўныя комплексы, збудаванні, якія прызначаны для правядзення фізкультурна-аздараўленчых, спартыўных ды спартыўна-відовішчных мерапрыемстваў, якія маюць прасторава-тэрытарыяльныя межы [5].

Дастаткова распаўсюджаным з’яўляецца меркаванне пра прыкметы, якія уласцівы юрыдычным асобам. Прыведзеныя прыкметы адначасова дазваляюць прызнаваць гэтых асоб самастойнымі суб’ектамі грамадзянскіх праваадносін:

1) арганізацыйнае адзінства;

2) маёмасная адасобленасць;

3) самастойная маемасная адказнасць по сваіх абавязках;

4) выступленне ў грамадзянскім абароце, а таксама пры вырашэнні спрэчак у судах ад уласнага імя [6, с. 190].

Такім чынам, фізкультурна-спартыўныя збудаванні, якія «находятся на балансе коммерческих организаций государственной и негосударственной форм собственности, санаторно-курортных учреждений» [4, с. 117] не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі. Іх варта разглядаць толькі ў якасці аб'ектаў грамадзянскага права, і, такім чынам, аб’ектаў (а не суб’ектаў) спорту і турызму.

Артыкул 25 Закона Рэспублікі Беларусь «О физической культуре и спорте» вызначае, што фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўныя цэнтры могуць мець ва ўласнасці, гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні фізкультурна-спартыўныя збудаванні. Фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўныя цэнтры (камбінаты, комплексы, цэнтры фізкультурна-аздараўленчай работы) могуць ствараецца у любой арганізацыйна-прававой форме у адпаведнасці з заканадаўствам.

У Рэспубліцы Беларусь могуць ствараецца камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі фізічнай культуры і спорту [3].

Пералік арганізацыйна-прававых форм юрыдычных асоб усталяваны Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Да камерцыйных арганізацый адносяцца:

- гаспадарчыя таварыствы (поўнае і камандзітнае);
- гаспадарчыя таварыствы (акцыянернае таварыства (АТ), таварыства з абмежаванай адказнасцю (ТАА), таварыства з дадатковай адказнасцю (ТДА));
- вытворчыя кааператывы;
- унітарныя прадпрыемствы (дзяржаўныя і прыватныя);
- сялянскія (фермерскія) гаспадаркі.

Да некамерцыйных арганізацый адносяцца:

- спажывецкія кааператывы;
- грамадскія арганізацыі;
- рэлігійныя арганізацыі;
- фонды;

PolotskSU

- ўстановы;

- рэспубліканскія дзяржаўна-грамадскія аб'яднанні;

- аб'яднання юрыдычных асоб і (або) індывідуальных прадпрымальнікаў (асацыяцыі і саюзы) [7].

У Рэспубліцы Беларусь распаўсюджанымі з'яўляюцца такія арганізацыйна-прававыя формы названых суб'ектаў спартыўнага права, як установы дзяржаўнай формы ўласнасці. У прыватнасці, Віцебскі абласны выканаўчы камітэт у пераліку «Фізкультурна-спартыўныя клубы і цэнтры» паказывае ДУ «Глыбокскі раённы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр», ДУ «Лепельскі раённы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр» і іншыя [8].

Прыкладам разглядваемых суб’ектаў, якія зарэгістраваны і дзейнічаюць у розных арганізацыйна-прававых формах у горадзе Мінску, з’яуляюцца:

– Фізкультурна-аздараўленчы комплекс Атлант (ЗАТ «Атлант»);

– МГА «Фізкультурна-спартыўны клуб «Волат» – (маладзёжнае грамадскае аб'яднанне);

– Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Мир фитнеса»;

– Прыватнае фізкультурна-аздараўленчае унітарнае прадпрыемства «МАД МАКС ФАЙТ ЛАБ»;

– ФАЦ імя П.М. Машэрава (РУП Комплекс па аказанні паслуг имя П.М. Машерава) – рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства;

– і іншыя [9].

У сувязі са спецыфікай юрыдычных асоб ў выглядзе сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, стварэнне фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных цэнтраў у дадзенай арганізацыйна-прававой форме не прадугледжваецца.

У ліку мэтаў фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных цэнтраў Закон Рэспублікі Беларусь «О физической культуре и спорте» ўсталёўвае фізкультурна-аздараўленчую і (альбо) спартыўна-масаваю работу. Артыкул 25 Рэспублікі Беларусь Беларусь «О физической культуре и спорте» вызначае, што фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўныя цэнтры могуць аказваць на базе належачых ім фізкультурна-спартыўных збудаванняў фізкультурна-аздараўленчыя паслугі.

Такім чынам, фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўныя цэнтры, а таксама фізкультурна-спортыўныя клубы, якія маюць статус юрыдычных асоб і аказваюць аздараўленчыя паслугі, ў тым ліку турыстам, могуць лічыцца суб’ектамі аздараўленчага турызму.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. Максименюк, В.В. Генезис законодательства Республики Беларусь об оздоровительном туризме / В.В. Максименюк // Конституционные права и свободы: проблемы интерпретации и реализации в национальных правовых системах: сборник статей международной научно-практической конференции Полоцкого государственного университета в 3 т.; редкол.: И.В. Вегера (отв. ред.), Богоненко В.А. [и др.]. – Новополоцк: ПГУ. – Т. 2. – 2016. – С. 304–312.

2. О государственной аттестации санаторно-курортных и оздоровительных организаций [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь,

PolotskSU

1 ноября 2006 г., № 1450 : в ред. пост. от 29.03.2016 г. № 256 // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Мінск, 2017.

3. О физической культуре и спорте [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 4 янв. 2014 г., № 125-З // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Мінск, 2017.

4. Непряхин, П.П. Вопросы повышения эффективности физкультурно-спортивных сооружений // Спортивное право в Республике Беларусь. Сборник статей. Выпуск 5. / П.П. Непряхин // Минск: Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2015. – С. 117–120.

5. О новой редакции модельного закона «О физической культуре и спорте» [Электронный ресурс] : постановление Межпарламентской Ассамблеи государств – участников Содружества Независимых государств от 3 дек. 2009 г. № 33-23 // В.С. Левоневский. – Режим доступа: http:// pravo.levonevsky.org›Право 2011›republic08/text358.htm. – Дата доступу: 22.05.2017.

6. Чигир В.Ф. Юридические лица / В.Ф. Чигир // Гражданское право : в 3 т. / под ред. В.Ф Чигира. – Минск : Амалфея, 2008. – Т. 1. – Гл. 7. – С. 189–383.

7. Гражданский кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 7 декабря 1998 г., № 218-З : Принят Палатой представителей 28 октября 1998 г. : одобр. Советом Респ. 19 января 1998 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 09.01.2017 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Мінск, 2017.

8. Физкультурно-спортивные клубы и центры (ФСК, ФСЦ) [Электронный ресурс] // Офиц. сайт Витебск. обл. исп. комит. – Режим доступа: http://www.vitebsk-region.gov.by›ru/fizkulturno-sportivnye…i… – Дата доступу: 12.06.2017.

9. Спортивно-оздоровительные центры в Минске [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://www.dumki.by›minsk/catalogue/sport-centers. – Дата доступу: 14.06.2017.